**Індывідуальны карэкцыйна-развіваючы занятак па фарміраванню вымаўленчага боку маўлення для выхаванца старшага дашкольнага ўзросту, які навучаецца па вучэбнаму плану спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення**

**Тэма: Фарміраванне ўменне правільна вымаўляць гук [Л] у прамых націскных складах у сярэдзіне слова**

**Праграмны змест**: замацаваць уменне правільна вымаўляць гук [Л] у прамых націскных складах у пачатку слова, зваротных складах у канцы і сярэдзіне слова; фарміраваць уменне правільна вымаўляць гук [Л] у прамых націскных складах у сярэдзіне слова. Развіваць фанематычныя ўяўленні: вызначэнне наяўнасці гука ў складах, словах; уменне дзяліць словы на склады і вызначаць іх колькасць, вызначаць апошні гук у слове; развіваць прасадычны бок мовы. Развіваць граматычны лад маўлення: утварэнне множнага ліку назоўнікаў адзіночнага ліку, утварэнне прыналежных займеннікаў. Развіваць уменне арыентавацца ў прасторы, ва ўласным целе, вызначаць становішчы прадметаў адносна адно аднаго, цэласнасць успрымання. Развіваць зрокавую і слыхавую ўвагу і памяць, агульную, дробную і артыкуляцыйную маторыку, мысленне і мову, графічныя навыкі. Выхоўваць упэўнінасць жаданне прыйсці на дапамогу.

**Абсталяванне:** прадметныя малюнкі з гукам [Л]**,** указка, дыдактычны дапаможнік “Птушка”, цацка Лунцік, запіс гука самалёта.

**Ход занятку**

1. Арганізацыйны момант. Стварэнне станоўчага эмацыянальнага настрою .

Педагог: Добры дзень, Давыд! Я рада бачыць цябе, давайце усміхнемся адно аднаму і з добрым настроем пачнем наш занятак.

Педагог: Паглядзі навокал і адкажы што ў цябе зверху, знізу, ззаду, зпераду. Паднімі: левую руку, правую руку, левую ногу. Выканай практыкаванне: руку правую на бок, ногу левую на носок; руку левую ўперад, ногу правую назад. Зрабілі зарадку, цяпер сядай на месца.

2. Асноўная частка.

Педагог:Прапаную размяць нашы пальцы і зрабіць пальчыкавую гімнастыку:

Мы ў лес пайшлі –ш-ш-ш,
(Хлопчык трэ далоні паміж сабою)
Праз мост перайшлі-шлёп –шлёп-шлёп,
(Хлопчык дапонямі пляскае па стале)
Да дрэва падыйшлі- топ-топ-топ,
(Хлопчыккулакамі стукае па стале)

А там мядзведзь, як пачаў раўсці “У-у-у”,
(Хлопчык гучна вымаўляюць гук [У] , рукі падняты ,пальцы выпрастаны ўперад і раскрыты)
Мы назад –топ-топ –шлёп –шлёп –ш –ш ,
(Хлопчык ў адваротным парадку паўтарае усе адпаведныя руху)
І схаваліся.
(Хлопчык робяць рукамі “Домік” над галавой).
Сюрпрызны момант. Гучыць гук самалёта з’яўляецца Лунцік
Лунцік: Добры дзень, паважаныя! Са мною здарылася бяда. Мой касмічны карабель пралятаў побач і я знянацку націснуў нейкую кнопку і катапульціраваўся, інакш кажучы, апрануўся тут. Як называецца ваша планета? Што вы тут робіце?
Педагог: мы гуляем з гукамі і словамі.
Лунцік: Цікава, а можна мне паназіраць, як гэта вы робіце?
Педагог: Давыд, пакажам Лунціку, як мы гуляем са словамі? (Адказы хлопчыка).
Педагог: Каб правільна вымаўляць гук [Л] неабходна зрабіць артыкуляцыйную гімнастыку. Выканаем практыкаванні “Усмешка”,
“Накажам непаслухмяны язычок”, “Смачнае варэнне”, “Індыкі балбочуць”, “Конік”, “Гадзіннік”, “Параход гудзе”. (Дзіця выконвае практыкаванні разам з педагогам)
Педагог: Каб правільна вымавіць гук [Л], неабходна ўсмехнуцца, кончык языка праціснуць паміж зубамі і вымавіць прцягла гук [Ы]. Так у нас атрымаецца песенька самалёта. (Хлопчык вымаўляе ізаляваны гук [Л]).
Лунцік: Сапраўды так, мой карабель таксама так спявае, калі набірае вышыню.
Педагог: А зараз прайдзем пальчыкамі па дарожцы, адначасова прамаўляючы склады з гукам [Л]. Прагаворваць гэтыя склады з рознай сілай голасу: грамка, ціха.
(Хлопчык прамаўляе прамыя склады: ла-ло-лу-лы-лэ з рознай сілай голасу).
Лунцік: Мне вельмі падабаецца гэты гук.
Педагог: А цяпер пагуляем у гульню “Хлапушка”. Будзем “лавіць” гук у далоні: паўтараць склады, словы з гукам [Л]. (Хлопчык выконвае заданне)
Лунцік: Зразумеў, зразумеў, паслухай, Давыд, а ў маім імя ёсць гук [Л].
(Хлопчык вымаўляе слова Лунцік, вызначае, што ў ім гук [Л]).
Лунцік: Вось добра, што ў маім імя ёсць гук [Л], цяпер гэта самы любімы мой гук. Давыд, я люблю разглядаць малюнкі. Але найбольш за ўсё мне падабаюцца малюнкі прадметаў, у назвах якіх ёсць гук [Л].

Паглядзі на малюнкі, знайдзі сярод іх тыя, у назвах якіх ёсць гук [Л], назаві гэтыя прадметы так, каб добра быў чутны гэты гук.
(Дзіця адбірае малюнкі ў назвах якіх ёсць гук [Л], выразна называе іх і выстаўляе іх на дошку).
Лунцік: Цудоўна, шмат прадметаў ты знайшоў і вельмі прыгожа назваў іх, я добра чуў гук , які мне падабаецца. Цяпер паспрабуй назваць прадмет, які я загадаў, я буду называць дзе ён знаходзіцца, а ты вызначыш становішча прадмета і назавеш яго. Напрыклад: Гэты прадмет знаходзіцца пад лодкай, гэта… далоні.
(Хлопчык знаходзіць і называе прадметы , араентуючыся на прадметы, якія называе Лунцік).
Лунцік: Добра справіўся Давыд! Назваў усе словы, пра якія я задумаў. Пара адпачыць, а як вы адпачываеце?
Педагог : Мы з Давыдам пагуляем ў гульню "Самалёты", а за намі паназірай.
(Педагог разам з дзіцём выконваюць лагарытмічнае практыкаванне "Самалёты"):
Самалёты адпачываюць, ( Хлопчык сядзіць на кортачках)
Самалёты заводзяць маторы, ( Хлопчык круціць рукамі перад сабою)
Самалёты ўзлятаюць, (Хлопчык разводзіць рукі ў бакі)
Самалёты лятаюць, (Хлопчык бегае па кругу і ў розных напрамках)
Самалёты на пасадку, (Хлопчык паслядоўна, прыпыняецца, апускае рукі)
Самалёты адпачываюць (Хлопчык садзіцца на кортачкі).
Лунцік: У мяне на дошцы намаляваны тры касмічныя караблі, тебе неабходна вызначыцы прадметы. якія неабходна пакласці ў кожны карабель. Прадметы ў назвах якіх адзін склад, ты будзеш класці ў касмічны карабель з лічбаю 1, калі у назве два склады – у касмічны карабель з лічбаю 2, калі тры склады- у касмічны карабель з лічбаю 3.
( Давыд самастойна выконвае заданне, адлічвае склады, пляская ў далоні).
Лунцік: Ты добра справіўся з гэтым заданнем, цяпер выбяры прадметы, якія падабаюцца табе і скажы аб гэтым. Напрыклад: Мой казёл, мая лама.
(Хлопчык выбярае прадметы, называя іх)
Педагог: А цяпер назаві прадметы, якія я загадаю:
- Драпежная рыба;
- Будаўнічы інструмент;
- Частка цела.

Педагог: Давай пакажам Лунціку, як мы ўмеем лічыць прадметы, выбяры прадметы, якія ты хочаш палічыць.

(Хлопчык выбярае прадмет і лічыць, практыкуючыся ў дапасаванні назоўнікаў і лічэбнікаў)
Педагог: Малайчына, добра можаш лічыць прадметы і прыгожа вымаўляць гук [Л]. Давай Лунціку пакажам гульню, у якой мы раскажам пра пілу:

Запіліла піла,
Адпіліла кусок,
Наскочыла на сучок,
Лопнула і стала, сабе зуб зламала.

(Хлопчык разам з педагогам выконвае моўную гульню, прагаворваючы верш і адначасова выконваючы рухі рукамі).
Лунцік: Вельмі цікавая гульня. Мне яна спадабалася, мне таксама спадабалася як ты прыгожа вымаўляў гук [Л].
Педагог: Давыд, у цябе ўсё добра атрымліваецца. Ты малайчына. Прапаную табе паказаць Лунціку, як ты ўмееш вызначаць гук у канцы слова. Вядзем указкай па схеме слова, прамаўляючы слова і слухаем, які гук мы чуем у канцы слова.
(Хлопчык вызначае апошні гук у слове, працуя з гульнявым дапаможнікам “Птушка”).
Лунцік: Малайчына, цяпер я буду ведаць, як вызначаць гук, які вымаўляецца ў канцы слова. Ой. Мне перадалі сігнал, што хутка мой карабель будзе зноў пралятаць побач. Каб мне трапіць на яго, табе неабходна гучна вымавіць назву прадмета, якая зашыфравана на малюнку.
Лунцік: Малюнак неабходна скласці з 4 частак. На адваротным боку кожнай частцы напісана чыстагаворка. Прагаворваеш чыстагаворку, пераварачваеш картку – частку малюнка, калі скажаш 4 чыстагаворкі, атрымаеш 4 часткі і зможаш скласць прадмет.
(Давыд прагаворвает чыстагаворкі з прамымі складамі з гукам [Л], пераварочвае 4 часткі і складае слова юла)
Лунцік: Малайчына, у цябе атрымалася, ты мне дапамог. Цяпер заплюшчвай вочы, гучна тры разы вымаві слова “Юла”.
(Хлопчык выконвае заданіе, прамаўляе слова “Юла” тры разы гучным голасам.) (Гучыць шум самалёта, Лунцік знікае)
Педагог: Вось такая незвычайная сустрэча адбылася ў нас на занятку. Хто нас наведаў? Якія заданні Лунціка мы выконвалі? Які гук вучыліся вымаўляць правільна? Ці спадабаўся табе занятак. Дзякую табе за працу да сустэчы.